Інга Воюш

# Вобраз жанчыны ў апавяданнях І.Навуменкі

Проза І.Навуменкі станавілася аб’ектам даследавання неаднаразова. Напрыклад, тэма кахання ў прозе пісьменніка даследавана даволі шырока. Згадаем прадмову да першага тома ягонага “Збору твораў”, дзе В.Каваленка падрабязна раскрывае перыпетыі станаўлення пісьменнікавага погляду на гэта пачуццё. Разам з тым неабходна адзначыць, што не заўсёды пільная ўвага крытыкі надаецца аб’екту кахання – а іменна, жаночаму персанажу.

Звернемся да шматлікіх жаночых вобразаў І.Навуменкі, іх ролі і месца ў яго апавяданнях. Каханне да дзяўчыны, жанчыны – адна са скразных тэм, а вобраз жанчыны-каханай пранесены праз усю творчасць пісьменніка. Думаецца, яго ўзнікненне звязана з вострымі перадваеннымі ўспамінамі таго юнацтва, якое не спаталіла смагу па сапраўдным каханні, не паспела стаць дарослым, а адразу пасля вайны як бы вярнулася не ў сваё мінулае, а ў іншае, пакалечанае вайной жыццё, дзе ўсё вельмі далёка ад явы.

У ранніх творах прадметам захаплення, першага кахання выступае юная дзяўчына (“Семнаццатай вясной”, “Таполі юнацтва”),  школьніца (“Вераніка”), студэнтка (“Над ціхай Віццю”). Для “недакаханага” пакалення юнакоў перадваеннай пары сціплае першае каханне – амаль усё, што было светлага ў іх жыцці. Апавяданні І.Навуменкі як бы пра эвалюцыю кахання на працягу жыцця чалавека, пра сталенне, пра вечную загадку жанчыны. У галоўнага героя “Семнаццатай вясны” Цімоха ў вельмі, здавалася б, неспрыяльны час – акупацыю – абуджаецца пачуццё да незнаёмкі Стасі. Розумам імкнучыся да жорсткага супраціўлення ворагу (што, магчыма, было данінай пісьменніка часу), душой ён цягнецца да вечна новага адчування шчасця: бачыць “белую дзяўчыну” “ў белай сукенцы, з белым капялюшыкам на галаве”, якая “была зусім не падобная на дзяўчат”, якіх сустракаў дагэтуль. Напярэдадні Вялікай Айчыннай іранічныя аднакласнікі разумніцы Веранікі (“Вераніка”) і “першага сярод хлопцаў” Славы ўстанаўліваюць, што паміж імі “нешта ёсць”, але здзейсніцца, выявіцца гэтаму каханню не было суджана: Вераніка праводзіць хлопца на фронт, а сама пазней гіне ад рук фашыстаў. Менавіта ў гэтым апавяданні І.Навуменка згадвае адзін з самых ярка выяўленых ідэйных кантрапунктаў ваеннай і пасляваеннай беларускай прозы пра сэнс змагання (К.Чорны, І.Мележ, В.Быкаў) – найперш мужчына павінен абараніць жанчыну. Вось як інтэрпрэтуе

гэту думку І.Навуменка: "Нас *(з аднакласнікаў Веранікі. – І.В.)* вярнулася з вайны толькі шасцёра, і ўсё ж мы не змаглі абараніць Веранікі" [2, 30].

Калі сачыць за развіццём пачуццяў, то ў творы "Таполі юнацтва" герой ужо адчайваецца ўслых прызнаца Гэлі, сястры свайго сябра, у каханні, праўда, яна даволі халодна ставіцца да гэтага, але адказвае яму лістом. У Гэлі ўжо няма нічога настолькі незвычайнага, як у Вераніцы ці Стасі. Яна дарагая тым, што каханая.

Што ж да вайны, то яна адабрала самы росквіт пачуццяў і ў дзяўчат, жанчын, і ў хлопцаў. Так, траім героям "Дома над морам" "дзяўчаты пісалі пра каханне, і траім пра дружбу… Трое кавалераў "Славы" яшчэ ні разу не цалавалі дзяўчат. Проста не паспелі" [2, 45]. Жанатых сярод іх не было. Мабыць, гэтыя маладыя людзі, ледзь не падлеткі, якія бачылі смерць і гора, маглі разлічваць на тое, каб "далюбіць" сваіх дзяўчат пасля перамогі. Але вялікая бяда закранула і іх каханых.

Менавіта пра незваротнасць юнацтва апавяданні "Па махорку" і "Салдаты вярнуліся". Гарбач, шукаючы сваю Клару, верыў, што тая "будзе чакаць яго, бо пасля ўсяго, што ён пабачыў на вайне, яна проста не мела права растаптаць тое святое і незабыўнае, што між імі намецілася"  [2, 69]. Сустрэўшыся з ёй, халаднаватай, адчужанай, франтавік моцна задумаўся, у чым жа прычына. "Ці такая яна, як раней?.. Дый гэта не галоўнае. Ці сам я такі?.." [2, 69] – разважае ён.

Пасля вайны людзі сустракаюцца спустошаныя, зняверанныя, воляй лёсу заручаныя, жанатыя. Яны наракаюць адно на аднаго і на тое, што "нешта важнае ў жыцці… зразумелі не так, як трэба" [2, 42], адмовіліся ад свайго кахання, не скарысталі свой шанц на шчасце. Разумее, што нешта непапраўна страчана, Васюковіч з апавядання "Рэйкі". Думаючы, што ён загінуў, яго каханая Валя Сасноўская выйшла за палоннага камандзіра. Вайна перамяніла Валю (муж загінуў, яе малое дзіця памерла, пакуль яе як партызанку катавалі фашысты), і пры такой доўгачаканай сустрэчы Васюковіч са здзіўленнем убачыў у ёй "кагосьці другога, малазнаёмага, каго ён, каб і хацеў, не мог успомніць" [2, 72]. Валя спрабуе  абвінаваціць Васюковіча:  "Чаму са мной не ажаніўся, як скончылі інстытут?" [2, 72], але юнакі пасталелі, і абодвум ясна, што такія выпрабаванні, якія выпалі ім, не праходзяць проста так. Гэта аддаленасць ад жанчыны, якая ў ранніх апавяданнях тлумачылася недасягальнасцю, узвышанасцю юначага ўспрыняцця, у больш позніх паказваецца як свядомая адчужанасць, пэўная недатыкальнасць "тэмы былых пачуццяў" як балючай, нерэалізаванай. Так, даўняе, няспраўджанае праз вайну каханне разводзіць герояў, але грэе і паліць ім сэрца на працягу ўсяго жыцця.

Антываенным пафасам прасякнута і апавяданне "Іван ды Мар'я". Адзінокая сямідзесяцігадовая Мар'я дажывае свой век адна. Яна з тых жанчын, у каго першая вайна

адабрала каханага (казака Хведзьку), другая – мужа (Івана). Толькі яна, яе памяць занатавалі той трохмесячны перадваенны баль кахання ды ціхія гады сямейнага шчасця, якія ёй суджана было перажыць і страціць назаўсёды. Яна з мудрай развважлівасцю назірае за бурнымі перыпетыямі асабістага жыцця сваёй кватаранткі Валі, і на гэтым фоне асабліва кантрастна праступае вялікі боль ад несправядлівых страт, што жыве ў яе душы.

У нечым набліжаны да Мар'і вобраз з першага погляду не падобнай да яе Ані з апавядання "Неспакой". Не дужа, здавалася б, працавітай, не надта цнатлівай жанчыне давялося перажыць трох мужоў. Але пакінула яна іх не сама. Другі муж, старшыня сельсавета, на якога напісалі данос ("пісулю"), знік з вёскі назаўжды, трэці – інжынер – быў расстраляны фашыстамі.

У сталы перыяд творчасці асабліва актуальнай становіцца тэма здрады ў каханні, перажывання інтэлігентамі ахаладжэння пачуццяў, забароненых сустрэч. Ідэалам для пісьменніка у гэты час выступае вобраз дзяўчыны-студэнткі з апавядання "Вальс кветак". Галоўны герой Кастравіцкі, які адпачывае каля аграбіястанцыі, становіцца сведкам трагедыі – прыгажуня-адналюбка з-за здрады ёй у каханні заканчвае жыццё самагубствам. Аўтар захапляецца сілай, рамантычнай узнёсласцю і шчырасцю яе пачуцця, увесь пал якога раскрыты ў дзённіках гераіні, якія прыносяць пачытаць Кастравіцкаму. Асабліва дысгарманічна, дысанансна выглядае ў гэтым высока напружаным кантэксце прыезд да Кастравіцкага даўняй жончынай сяброўкі з мэтай пабавіць з ім час.

Тэма здрады, найперш духоўнай, калі каханне насцігае ў сталым узросце, калі ён – жанаты, яна – замужам, пачата І.Навуменкам яшчэ ў апавяданні "Па махорку" і працягнута у апавяданнях "Сукенка Ларэлеі", "Выбар", "Над ціхай Віццю" (маецца на ўвазе вобраз Вольгі Апалонаўны). Як трапна заўважае В.Каваленка, нерашучыя ў каханні персанажы пісьменніка – пераважна інтэлігенты, такія, як Вігдароўскі і Рыта. Але Вольга Іванаўна, якую аўтар называе "сволаччу" і "пахатлівай жывёлінай", і Вольга Апалонаўна (па трапным азначэнні яе мужа Пеўніка – жанчына-"бухгалтэрыя") не зусім падыходзяць да гэтага азначэння. Для аўтара гэта здрадніцы не толькі ў каханні, але і ў жыцці: першая, калі Багамолец ("Выбар") быў начальствам у раёне, прыбягала да яго ў лазеньку, а падчас вайны прагнала з двара, другая – усё лічыць на грошы, нават каханне. Дараваць жанчыне прадажнасць у пачуцях пісьменнік не можа.

Асобна стаіць сярод апавяданняў пісьменніка твор "Новая хата". Апавядальнікам у ім з'яўляецца хлопчык, бацькі якога будуюць новую хату, праз яго дзіцячае ўспрыняцце мы бачым значнасць і каштоўнасць вобраза маці. Нелады ў сям'і малы ўспрымае праз боль жанчыны, ён успрымае здзек з яе, грубасць бацькі як уласную абразу і, бы малое птушанё, кідаецца на абарону. Традыцыйнае жаночае доўгацярпенне І.Навуменка

паказвае праз шматразовае паўтарэнне жанчынай-маці пры ўсякай сутычцы адной фразы: “Пацярпі, сынок, вось паставім хату…”. Як закляцце, яна кажа гэтыя словы і сыну, і, мабыць, сабе. У фінале твора, насуперак чаканню чытача, маці нават адмаўляецца перайсці з бацькам у новую хату, бо для яе хата – гэта не столь і падлога, а духоўнае прыстанішча, у якім не можа жыць зло, грубасць і здзек.

Раскрыццё жаночага вобраза І.Навуменкам адначасова своеасаблівае і традыцыйнае. Як ужо склалася ў літаратуры, у яго творчасці бачым каханую дзяўчыну, сталую жанчыну, жанчыну-маці, але амаль не сустрэнем жанчыны-гераіні, змагаркі, жанчыны-мачыхі, дзіцяці. Калі абставіны ў яго творах рэалістычныя, то стаўленне да жаночага вобраза бліжэй да рамантычнага, накшталт прозы У.Караткевіча, дзе вобраз каханай унутрана матывуе галоўнага героя да дзеяння (згадаем “Семнаццатай вясной”, “Над ціхай Віццю”).

Пачуццё да жанчыны, намаляванае ў прозе І.Навуменкі, не экзальтаванае, страснае або эратычнае – яно ўзнёслае, чыстае, светлае, крыху прыхаванае ад чужых вачэй. Часцей гэта каханне-ўспамін, каханне-мінулае, каханне-згадка. Успамін пра жанчыну – гэта вяртанне ў сябе, маладога, імкненне перажыць тое, што толькі вымалёўвалася, толькі накрапвала, каб стаць цёплым дажджом кахання.

Знешні воблік гераінь прарысаваны няярка, рэдка дэталізавана, Яна для пісьменніка – проста каханая. Значэнне жанчыны для галоўнага персанажа апісана традыцыйна, апасродкавана – праз адносіны да яе галоўнага героя. Адзін дзеля каханай ездзіць на цягніку з суседняга горада (“Сукенка Ларэлеі”, Вігдароўскі), другі ідзе пешшу па чыгунцы (“Па махорку”), трэці прыязджае ў горад маладосці (“Сіні снег”, Віктар Пасашка).

Літаратура:


1. Каваленка В. І радасць, і смутак, і боль… // Навуменка І. Выбраныя творы. У 2 т. Т. 1: Апавяданні. Аповесці. – Мн.: Маст. літ., 1995. – С. 5-12.
2. Навуменка І. Выбраныя творы. У 2 т. Т. 1: Апавяданні. Аповесці. – Мн.: Маст. літ., 1995. – 478 с.